Cana 10 hr. Pierasyłka apłačana ryčałtam

Nr. 29 (670). Wilnia, Niadziela 21 Červienia 1936h. Hod XII (XX)

БЕЛАРУСКАЯ КРЫНІЦА | BIEŁARUSKAJA KRYNICA

Palityčnaja, hramadzkaja i litaraturnaja hazeta.

Adras Redakcyi i Administracyi: WILNIA, ZAWALNAJA 1—1 (Wilno, Zawalna 1—1). Redakcyja adčyniena ad 9 hadz. ran. da 4-aj uwieč.

HAZETA WYCHODZIĆ RAZ U TYDZIEŃ.

Košty wydawańnia pakrywajuć składki. Składka u hod 4 zał., na paŭhoda — 2 zał., na 3 miesiacy — 1 zał.

Новая Канстытуцыя СССР

Польская Тэлеграфная Агенцыя падала нядаўна гэткую вестку з Масквы: Цэнтральны Выканаўчы К-т СССР у справе новай савецкай канстытуцыі пастанавіў — 1) зацьвердзіць праект канстытуцыі, 2) склікаць Кангрэс Саветаў СССР, каб гэты праект разважыць, 3) датай скліканьня кангрэсу азначыць 25 лістапада 1936 г. і 4) праект канстытуцыі падаць да публічнага ведама, каб магло яго разважыць усё насельніцтва.

Пасьля гэтай весткі назаўтра тая-ж Польск. Аг. Тэл. падала і зьмест праекту новай савецкай канстытуцыі, галоўныя пункты каторай выглядаюць гэтак:

— Калгасы атрымліваюць зямлю на вечнае валаданьне. Нароўні з соцыялістычным спосабам гаспадаркі, дазваляецца, на прыватнае валаданьне зямлёй, апёртае на працы асабістай. Грамадзяне маюць права на асабістую ўласнасьць, як дамы, малыя гаспадаркі і прадметы асабістага карыстаньня.

У склад СССР уходзіць 11 саюзных рэспублік, замест дасюлешніх 7. Кожная саюзная рэспубліка мае сваю ўласную канстытуцыю і мае права выступіць з саюзу. Калі-б наступіла разыходжаньне між правам рэспублікі саюзнай і правам усесаюзным,—абавязвае права саюзнае.

Найвышэйшым органам дзяржаўнай улады СССР зьяўляецца найвышэйшы савет СССР (Верховный Совет), да якога належа ўлада ўставадаўчая. Гэты найвышэйшы савет складаецца з двух палатаў: палаты саюзнай і нацыянальнай. Саюзную палату выбіраюць грамадзяне СССР паводле нормы 1 на 300 тыс. насельніцтва. У склад нацыянальнай палаты ўваходзяць дэпутаты, якіх выбіраюць найвышэйшыя саветы саюзных і аўтаномічных рэспублік і мясцовыя саветы.

Найвышэйшы савет СССР выбіраецца на 4 гады. Звычайныя сэсіі гэтага савету адбываюцца два разы ў год.

Прэзыдыюм найвышэйшага савету ёсьць адказным прад найвышэйшым саветам СССР. Компэтэнцыі гэтага прэзыдыюма дужа вялікія. Так напр. яно зьмяняе і назначае найвышэйшае кіраўніцтва ў войску, у часе між сэсіямі прэзыдыюм найвышэйшага савету абʻяўляе вайну, падпісвае мір, ратыфікуе міжнародныя дагаворы і інш.

Дэпутаты найвышэйшага савету СССР карыстаюцца правам асабістай недатыкальнасьці. Яны ня могуць быць арыштаваны ані суджаны бяз згоды найвышэйшага савету або яго прэзыдыюма.

Найвышэйшы савет на супольнай сэсіі выбірае ўрад СССР: раду народных камісараў. Рада камісараў адказная прад найвышэйшым саветам СССР.

Найвышэйшы савет у саюзных рэспубліках ёсьць аднапалатны. Органам дзяржаўнай улады ў краёх, правінцыях, вокругах, раёнах, гарадох і сёлах зьяўляюцца саветы дэпутатаў, выбраных на два гады.

Урад СССР або народны камісар СССР павінен адказаць на інтэрпэляцыю дэпутата ў працягу 3 дзён. Новая канстытуцыя трымаецца старога падзелу народных камісарыятаў на ўсесаюзных (абароны, заграничных спраў, загранічнага гандлю, камунікацыі, лучнасьці, водных транспартаў і цяжкога промыслу) і на саюзна-рэспубліканскія. Судзьдзяў выбіраюць 4-х прыкметным галасаваньнем на 3 гады.

Царква ў СССР ёсьць аддзеленай ад дзяржавы, а школа ад царквы. Канстытуцыя гварантуе свабоду веравызнаньня, а так-жа й свабоду прапаганды антырэлігійнай. Гварантуе такжа свабоду слова, прасы, сходаў, арганізацыяў.

Камуністычная партыя зьяўляецца перадавым органам працоўных і кіраўнічым асяродкам усіх арганізацыяў, як грамадзкіх, так і дзяржаўных.

Грамадзяне СССР маюць загварантаваную недатыкальнасьць асабістую: нікога нямożна арыштаваць інакш, як толькі на падставе загаду суду ці пракурора. Загварантавана недатыкальнасьць кватэры, тайніца лістоў. Загварантавана так-жа права азылю чужаземцаў. Кожны 18-летні грамадзянін мае права выбіраць і быць выбраным; гэтак сама і армія.

Выбары ў СССР агульныя, роўныя, беспасрэдныя й тайныя.

Права выстаўляць кандыдатаў маюць арганізацыі грамадзкія, партыйныя арганізацыі камуністычныя, профэсыянальныя саюзы, арганізацыі моладзі, а так-жа арганізацыі культурныя.

Кожны дэпутат мае абавязак здаваць са сваей працы справаздачу сваім выбаршчыкам і на падставе пастановы большасьці выбаршчыкаў можа быць пазбаўлены мандату. —

Гэтак выглядае праект новай савецкай канстытуцыі паводле Польск. Агенцыі Тэлеграфнай. Ясная рэч, што каб належна зразумець яе, трэба было-б мець тэкст поўны і аўтэнтычны. Спадзяёмся, што незадоўга газэты будуць мець і гэта. Аднак, маючы прад сабой і гэткі скарочаны і магчыма шмат у чым няточна перададзены тэкст новай савецкай канстытуцыі, хоць агульна можна аб ей мець паняцьце.

У гэтай новай канстытуцыі прадусім кідаецца ў вочы яе агульна-палітычны характар, які ей надае тое, што камуністычная партыя ёсьць і далей адзінай легальнай партыяй і да таго, што на ей фактычна й будзе далей апірацца ўсё грамадзка-палітычнае жыцьцё ў СССР. Гэты факт утрудняе зразуменьне магчымасьці ўсіх тых грамадзкіх і палітычных правоў і свабодаў, якія новая канстытуцыя гварантуе грамадзянам. Магчыма, што бескласавае грамадзянства ў СССР сапраўды і не патрабавала-б іншых палітычных партыяў апрача камуністычнай, але пад варункам, што й самую гэну партыю ў-ва ўсім сапраўды абавязывала-б канстытуцыя; тымчасам з тэксту канстытуцыі вынікае, што камуністычная партыя — гэта як-бы сувэрэн, абдараваны асаблівымі прывілеямі.

Асаблівасьцяй так-жа характэрнай зьяўляецца ў новай савецкай канстытуцыі справа ўласнасьці прыватнай. Як можна судзіць з гэнага скарочанага тэксту праекту канстытуцыі, дык савецкая палітыка ў гэнай галіне сапраўды крыху адступае прад жыцьцём і робіць уступкі ўласнасьці прыватнай; прынцыпова аднак трымаецца яна і надалей колектывізму; гэта-ж мае свае і дадатныя стораны, бо дае магчымасьць дзяржаве, ці грамадзянству, кантролі ўсё-ж справядлівейшага падзелу між грамадзянамі народнага багацьця, як у дзяржавах індывідуальнага капіталізму. Агулам гаворачы, сынтэза гаспадаркі асабістай і колектыўнай — здаецца сапраўды адказвае сучасным патрэбам працоўных масаў.

Далей, справа рэлігіі ў новай савецкай канстытуцыі такжа заслужвае на ўвагу. Справядлівая разьвязка гэтай праблемы — гэта сапраўды важная рэч і яўна гавора аб культуры такой ці іншай дзяржавы. Ведама, што тэорэтычна гаворачы, чэсная, поўная свабода верыць і ня верыць, так больш-менш, як напр. у Злучаных Станах Амэрыкі — гэта бадай найлепшая разьвязка праблемы веравызнаньняў у кожнай дзяржаве. Новая савецкая канстытуцыя, аддзяляючы царкву ад дзяржавы і школу ад царквы, гварантуе свабоду веравызнаваньня, а так-жа свабоду і прапаганды антырэлігійнай. Вось-жа тут няведама, ці ў Саветах будзе і гэна антырэлігійная прапаганда так, як і рэлігія, аддзелена ад дзяржавы і ад школы, гэта знача — ці дзяржава будзе, як і дагэтуль, паддзержываць бязбожніцкі рух, ці не. І калі яна нароўні будзе адносіцца як да рэлігіі, так і да бязбожніцтва, дык тады будзе там сапраўды свабода сумленьня, інакш, гутаркі аб гэтай свабодзе будуць звычайнай фікцыяй.

Урэшце трэба адцеміць, што Усходняя Беларусь у праекце новай савецкай канстытуцыі зьяўляецца саюзнай рэспублікай з сваім асобным урадам, як была дагэтуль, і — да таго — са сваім найвышэйшым саветам.

На заканчэньне трэба адцеміць, што новую савецкую канстытуцыю належна і ўсебакова можна будзе ацаніць толькі тады, калі яна будзе выконвацца.

Сябром Беларускага Народнага Абʻяднаньня і ўсяму беларускаму грамадзянству.

Камунікат № 4.

Прэзыдыюм Цэнтральнага Камітэту Беларускага Народнага Абʻеднаньня, разгледзіўшы пісьмы сяброў Рады Б.Н.А. — пісьмы галасаваньня анкетным способам у справе папраўак некаторых параграфаў праграмы Б.Н.А., і сьцьвердзіўшы правамоцнасьць гэтага галасаваньня, гэтым камунікатам падае да агульнага ведама наступнае:

1) абсолютная большасьць сяброў Рады Б.Н.А. падалі свой голас за ўсе папраўкі праграмы Бел. Нар. Абʻедн., апублікаваныя ў „Бел. Крыніцы“ № 25 з 24.V.1936 г., пададзеныя Прэзыдыюмам Ц.К. — Б.Н.А. „Пісьменным зваротам № 3“ з 11.V.1936 г.;

2) сябры Рады Б.Н.А. уласнаручна падпісалі „Пісьменны Зварот № 3“ Прэзыдыюму Ц.К. — Б.Н.А., у якім пададзены папраўкі праграмы Б.Н.А.;

3) у выніку гэтага галасаваньня ўсе папраўкі праграмы Б.Н.А., пададзеныя ў „Пісьменным звароце № 3“ Прэзыдыюмам Ц.К. — Б.Н.А. з 11.V.1936 г., прынятыя і ўлучаюцца ў цэласьць праграмы Беларускага Народнага Абʻеднаньня, абвешчанай у „Бел. Крыніцы“ № 4(645) з 24.I.1936 г.

ПРЭЗЫДЫЮМ Ц. К-ТУ БЕЛ. НАРОДН. АБʻЕДНАНЬНЯ

(—) *Я. Пазьняк* — Старшыня
(—) *Др. Ст. Грынкевіч* — I-шы Віцэ-Старшыня
(—) *М. Дварэцкі* — II-гі Віцэ-Старшыня
(—) *Інж. А. Клімовіч* — Скарбнік
(—) *Я. Найдзюк* — Сакратар.

Вільня, 12 VI.1936 г.

240364

75-leććie skasawańnia panščyny

Za hety artykuł administracyjnyja ūlady skanfiskawali Nr. 21 „Biel. Krynicy“ z 10.V.1936 h. Akružny Sud kanfiskaty hetaj nie zaćwierdziū i pastanowaj z 3.VI.1936 h. henuju kanfiskatu źniaū. — Dziela taho, što artykuł hety źjaūlajecca i ciapier aktualnym, drukujem jaho paūtorna biez paprawak. — Red.

Što takoje panščyna, nia treba šmat tłumačyć. Jašče žywuć staryja ludzi, jakija jaje pamiatujuć, abo ludzi, jakija ab panščynie čuli raskazy ad biespasrednych jaje świedkaū. Dawoli tut skazać ahułam, što panščyna ci, jak inakš jaje nazywajuć, pryhon— heta byū taki socyjalny paradak, pry jakim i ziamla i ludzi, što na ziamli pracawali, byli ūłasnaściaj panoū.

Śpiarša sialanie byli ludzi wolnyja, a tyja ziemli, na jakich jany pracawali, byli ich ułasnaściaj. Z bieham, adnak, času pany ziemli ich pazawajoūwali, a ich samych zrabili swaimi padniawolnymi słuhami, uważajučy ich, jak zwyčajnuju reč, ci skacinu, jakuju možna kuplać, pradawać, zamianiać i h. d. Tak napr. rasiejski piśmieńnik Karamzin piša, što ū kancy XVIII st. cana pryhonnaha sielanina była ad 35 da 80 rubloū, u tym-ža času za dobraha hončaha sabaku pany adzin druhomu płacili časam pa 3 tysiačy rubloū. Adzin pan, zaūważyūšy ū adnej pryhožaj dziaūčyny aktorskija zdolnaści, pradaū jaje za 5 tysiač rubloū. Uznoū-ža wiedamy paluboūnik carycy Kaciaryny II Patiomkin kupiū ad druhoha carycynaha paluboūnika Razumoūskaha ūsiu arkiestru: muzykantaū i instrumenty za 40 tysiač rubloū.

Ale ūsiakaje zło wiečna trywać na świecie nia moža, prychodzić čas, kali ūsiakaje zło licha biare. Pryjšoū kaniec i na panščynu. Ludzi parazumnieli, paświatleli i ūbačyli, što takoj hańby, jak pryhon, dalej ciarpieć nia možna. Skasawańnie jaje śpiarša adbyłosia ū Zach. Eūropie, a paśla pryjšła čarha na Rasieju i na Biełaruś. Pany ahułam nie chacieli sialanam dać swabodu i ūpiralisia pry panščynie. Tak napr., kali jašče ū 1855 h. rasiejski car Aleksandar II prypomniū u Maskwie na sabrańni panoū, što ūžo byū-by čas skasawać pryhon, ni adzin z ich cara ū hetym nie padtrymaū. A pany, za duža małymi wyniatkami, adnalkowyja, jak u Rasiei, tak i ū Biełarusi. Jany tolki tady zhadzilisia dać swabodu sialanam, kali ūbačyli, što ūžo ūsioroūna nia ūtrymajuć ich. Zmušali ich da hetaha sialanskija bunty, a tak-ža j sama pryhonskaja haspadarka, jakaja, jak pierastarełaja, z nadychodam i raźwićciom kapitalizmu ū Rasiejskaj imperyi, musiła ūstupić miesca haspadarcy nowaj, bolš racyjanalnaj i intensyūnaj, pry jakoj wialikija masy na panskaj ziamli pryhonnych sialan mała prynosili karyści i byli časta zwyčajnym ciažaram.

Aficyjalna aswabadžeńnie ū Rasiejskaj imperyi sialan ad pryhonu nastupiła carskim ukazam Aleksandra II 19.II.1861 h. Da Biełarusi, asabliwa da zachodnich jaje čaścin, z pryčyny polskaha paūstańnia 1863 h., jano dajšło akančalna tolki až u 1864 h.

Sutnaść skasawańnia pryhonu była ū tym, što sialan nadzialili ziamloj za wykup, razłožany na doūhaterminowuju spłatu. Dziela taho adnak, što susim pazbycca sialan, jak darmowaj pracoūnaj siły, panom było nie na ruku, dyk jany, ad jakich badaj wyklučna zaležyła nadzialańnie, dawali sialanam ziamli duža mała i prytym jaknajhoršaj, kab hetkim čynam dalej trymać sialan ekanamična zaležnymi ad dwara i jak najtaniej paśla najmać ich da siabie na pracu.

Pry hetkim „aswabadžeńni“ sialanam było trudna razžycca, a da taho sialanskija nadziely ūściaž drabilisia i drabilisia z pryčyny padzielu ich pry narastańni nasielnictwa.

Urešcie pryjšła wajna i rewalucyja i, dzielačaja Biełaruś, sawiecka-polskaja hranica. Kab paradzić sialanskaj biadzie, na toj bok henaj hranicy susim skasawali prywatnuju ūłasnaść i zawiali ziamielnyja haspadarki kolektyūnyja, supolnyja. Žyćcio adnak pakazała, što poūnaje skasawańnie prywatnaj ułasnaści, a hetym samym i złamańnie asabowaści čaławieka, da dabra nie wiadzie. Z hetaj pryčyny, choć niaznačna, ale pačałosia tam ad hetaha pryncypu niekataraje adstupleńnie.

Na hety bok sawiecka-polskaj hranicy na biełaruskich ziemlach trywaje faktyčna pradwajennaja, što stwaryłasia paśla panščyny, pałažeńnie sialanskaj prywatna-ūłaśnickaj haspadarki — drobicca jana dalej i robicca štoraz bolš ahułam jaūna niesamawystarčalnaj. Ziamielnaja reforma prawodzicca žaūłakowym šaham i da taho, jak heta widać z asadnictwa, maje časta bolš palityčnyja, jak ekanamičnyja mety.

Z hetaha bačym, što ziamielnaja prablema na biełaruskich ziemlach, jak na henym baku sawiecka-polskaj hranicy, tak i na hetym, dahetul nie raźwiazana i čakaje adpawiednaj apracoūki i naležnaha, zhodnaha z intaresami biełaruskaha narodu, wyrešeńnia.

Zdajecca nam, što BNA, jakoje ū swajej prahramie šukaje raźwiazki biełaruskaj ziamielnaj prablemy na padstawie syntezy haspadarki, apiortaj na ūłasnaści prywatnaj i kolektyūnaj, dzie hetaha wymahajuć wonkawyja warunki i pryhatawańnie psychičnaje, znachodzicca na prawilnaj darozie.

Astajecca tolki hetyja prahramnyja, duža ahulnyja, ziamielnyja pryncypy BNA, dapoūniūšy ich idejaj kooperatyzmu, dalej raspracoūwać i kankretyzawać.

Hetymi dumkami žadali my padzialicca z našymi čytačami z nahody minuūšych u lutym miesiacy sioleta 75 uhodkaū skasawańnia pryhonu.

Z hazet.

Prahrama abšarnikaū u adnosinach da Biełarusaū.

Hałoūny redaktar abšarnickaha „Słowa“ ū Wilni p. Cat u Nr. 163 z dn. 15.VI. hetaj hazety apublikawaū „prahramu na siańnia“, u jakoj pamiž inšym zaniaū wyraznaje stanowišča adnosna Biełarusaū. Stanowišča heta wykazana wielmi koratka i prosta, a imienna: — „adnosna Biełarusaū — asymilacyja“ — i bolš ničoha.

Jak bačym, apetyt u p. Cata zusim abšarnicki i jon na Biełarusaū hladzić, jak na pryhonnych mužykoū—prykazaū i musić być zroblena.

Zabyūsia, widać, p. Cat, što ūžo minuła 75 hadoū paśla panščyny, a Biełaruś užo kaža ūsiamu świetu, što jon choča žyć poūnym žyćciom swajej rodnaj kultury i ahułam być sam sabie haspadarom.

„Wileńszczyzna woła o ratunek“.

Takich i padobnych zahałoūkaū apošnim časam, u polskaj nawat presie, možna pabačyć wielmi mnoha. Pad hetkim zahałoūkam znachodzim tak-ža apisańnie pałažeńnia h. zw. „Kresów Wschodnich“ u Nr. 45 wychodziačaha ū Horadni časapisu „Nowe Życie“, u jakim pamiž inšym čytajem:

„Alarmujučyja wiestki z Wilenščyny ab hoładzie što-raz bolš pawialičwajucca. Što-raz usio bolš siemjaū astajecca biaz chleba i bulby. Najbolš hoład dajecca ū znaki žycharom: brasłaūskaha, dziśnienskaha, pastaūskaha, wałożynskaha, maładečanskaha, świancianskaha i wilenskaha pawietaū. 20 tysiač siemjaū molić ratunku i prosić chleba.

„Nawat siarednia-zamožnyja haspadary, z pryčyny niazwyčajna nizkich cenaū na bulbu i nadmierna wysokich cenaū na kramninu, a tak-ža nadmierna wysokich padatkaū, znajšlisia ū krajniaj biadzie.

„Nasielnictwa nia maje hrošaj na najzwyčajniejšyja patreby, a nawat na kaplu soli, a cukar wyjšaū užo z paūsiudnaha ūžytku. Sielanin prybywaje niekalki razoū u miastečka dziela taho, kab tam pradać astatki swajej majemaści. Časta zapłaciūšy wysokija tarhowyja apłaty, nia sumiernyja z wartaściaj praduktaū, waročajecca da chaty biez hraša“.

Tak, sapraūdy ciažkoje pałažeńnie nasielnictwa Wilenščyny, ale niatolki Wilenščyny, takoje-ž samaje pałažeńnie i Nawahradčyny i Paleśsia i inš. našych pawietaū.

Suproć abšarnikaū i kapitalistaū.

Apošnimi časami pajawiūsia dawoli cikawy artykuł u polskaj hazecie „Kurjer Poranny“, jakuju ūważajuć za orhan sučasnaha ūradu.

U hetym „cikawym“ artykule čytajem, što haspadarčaja prahrama, pradstaūlenaja wice-premjeram Kwiatkoūskim u Sojmie, jość pačatkam akcyi šmat šyrejšaj: da wyūłaščańnia abšarnikaū i adabrańnia dachodaū u wialikich pradpryjemstwach šlacham adpawiednaha apadatkawańnia. Apiswajučy ūradawuju haspadarčuju prahramu, artykuł hety ćwierdzić:

— treba pobač zarhanizawańnia dziaržawaj wialikich hramadzkich rabotaū i padniaćcia konsumcyjnaj zdolnaści pracoūnych masaū miesta i wioski, biezadkładna prystupić da likwidacyi dwornych abšaraū i h.d.—

Hety artykuł wyklikaū u endeckaj i kanserwatyūna-abšarnickaj presie čuć nia trywohu. Možna spadziawacca, što endecka-kanserwatyūna-abšarnickija hazety dahledziać u hetym artykule kamunistyčnyja ūpływy; bo-ž pawodle ichniaha sudžeńnia, chto damahajecca sprawiadliwaj ziamielnaj reformy i rasparcelawańnia dwaroū, abo ahraničeńnia wyzysku kapitalistaū, toj užo kamunist i antydziaržaūnik.

J—k.

Кніжка 3-я (7) „Калосься,“ беларускага літаратурна-навуковага часапісу ўжо друкуецца і выйдзе ў сьвет у палавіне месяца ліпня. Літаратурныя і навуковыя матарыялы — адпавядаючыя характару і вышыні часапісу — прысланыя да 1-га ліпня і ня зьмешчаны ў гэтай кніжцы будуць памагчымасьці зьмешчаны ў наступных кніжках.

Адрас: рэд. і адміністрацыя „Калосься“ — Вільня, Завальная 1—2.

Прысылайце на часапіс складкі! Складкі ў год — 2 зл., на асобную кніжку — 50 гр.

Міхась Машара.

8)

Лёгкі хлеб.

Драма ў трох актах, з жыцьця вясковай моладзі.

Зьява 6-я.

Уходзяць Васіль і Пятрусь.

Васіль — Тут, братка, прытулак нашага брата. Тут заўсёды знойдзеш страву для душы і цела. Гэта вось сталоўка, дзе заўсёды можна даволі смачна паесьці, а на‘т і выпіць чарку сівухі. Бо наш брат-пралятар любіць зграшыць падчас радасьці, ці гора, лішняй чаркай. А далей, у тыя дзьверы — бібліятэка-чытальня, крыніца соцыяльнай і нацыянальнай сьведамасьці і наагул усякае кніжнае мудрасьці.

Праўда, скромна, на‘т бедна, але затое чыста, са смакам і ў належным парадку.

Зьява 7-я.

Тыя-ж і Гаспадар.

Гаспадар — (*уходзячы*) Дзень добры! Чым змагу служыць?

Васіль — Добры дзень! Добры дзень! Прынясіце нам, калі ласка, пару піва, паўбутэлькі, ну і закусіць чагось!

Гаспадар — Зараз, зараз! (*выходзіць*).

Зьява 8-я.

Тыя-ж без Гаспадара.

Васіль — Я, праўду кажучы, амаль год ня быў ужо тут. Жанаты, братка, чалавек! Так заняты працай, што амаль няма часу і ў кніжку заглянуць і жыву далёка.

Але сядайма, братка, перакусім крыху, ды да мяне! Вось будзе рада Ганулька! Мы з ёй часта гаворым аб табе.

Пятрусь— Дзякую за памяць! Успамінаю і я вас.

Васіль — Мадзееш ты там, братка! Табе вось сюды, да нас перабрацца! Ці чытаеш хоць газэты? Ці мо‘ ня цікавісься ўжо грамадзкім жыцьцём?

Пятрусь — Цікавіцца —цікаўлюся... але грамадзкае жыцьцё ў нас на вёсцы вельмі слабое. Як тут у Вас справа? Усё-ж тут цэнтр!

Васіль — Слабавата, братка! (*Гаспадар прыносіць закуску і піва, і выходзіць*) Грызьні шмат! Дзе чуць пачне крэпнуць творчая праца, зараз зьявіцца, як зараза, нейкае разьяданьне. Але раскажы аб сабе! Як жывеш?

Пятрусь — А вось жыву... Эт так путаюся ды й годзі. Чытаю, калі што пападзецца Думаю па крысе... нуджуся часамі.

Васіль — Чаму ня кінеш усяго, ды не перабарэшся да нас? Пісаў-жа я табе... і працу быў знайшоўшы!

Пятрусь — Ня цягне мяне надта ў места. У вёсцы чуюся найлепш, незалежным і спакойным.

Васіль — З гэтым я згаджуся.

Пятрусь — Ды мястовае жыцьцё не падабаецца мне; руху, гулу, шуму многа... здурнець чалавек можа!

Васіль — Прывык-бы, братка!

Пятрусь — Праўда, усё тут прыгожае, бліскучае, выгаднае, але нейкае сьцюдзенае, нават людзі і тыя зусім іншыя! Вечны рух! Вечная барацьба!

Васіль — Ну што-ж? Жыцьцё—барацьба! Ды давай пачнём, што гутарыць насуха, (*бярэцца за чарку*) за тваё здароўе!

Пятрусь — На здароўе! (*п‘юць і закусываюць*) Так кажаш, барацьба! А перамагае заўсёды мацнейшы! Чуў ужо гэта.

Васіль — Так і павінна быць. А калі ты слабы, — шукай — слабога! Шукай такога, як ты, — лучыся! У гэтым моц слабых і шлях да перамогі!

Пятрусь — Яно, падумаўшы, быццам і так, але праціўна яна, гэта вечная траўля! Ды кінем аб гэтым. Лепш кажы, як ты жывеш? як здароўе Ганулькі?

Васіль — Нішто! Спачатку Ганулька сумавала па вёсцы, а цяпер прывыкла. Вось сына ўжо маем!

Пятрусь — Віншую!

Васіль — Дзякую!

Пятрусь—А як гадуецца цётка Мар‘яна?

Васіль — Здароўе нішто, ды да места прывыкнуць ня можа. Як ты, яго ня любіць. Усе больш з унукам дома. Ды зрэшта хутка сам убачыш усіх. Жадаў і бацьку забраць сюды, ды той і слухаць аб гэтым ня хоча. Як там здароўе яго?

Пятрусь — Яшчэ моцны — кратаецца!

Васіль — А ты чаму ня жэнішся?

Пятрусь — Ды вось не зьбяруся ніяк.

Васіль — Мо‘ па Верачцы тужыш усё? Ды як-жа яна? Дзе яна? Пасьля таго, як завёз яе той Крук?

Пятрусь — Ды так завёз, што на‘т бацькі ня ведаюць! Гаварылі, быццам тут у месьце яна. Быццам даўно ўжо кінуў яе той прахвост. Але дома ні слуху, ні духу аб ёй.

Васіль — (*барабанячы па стале*) Вось як? Ну што-ж, — кожны даскоча, чаго хоча. Цілігэнтаў хацела! Лёгкі хлеб сьніўся!

Зьява 9-я.

Тыя-ж і Гаспадар.

Гаспадар — Што трэба?

Васіль — Прынясіце, калі ласка, чагось яшчэ закусіць!

Гаспадар — Мо‘ гарачую катлетку?

Васіль — Можа быць і катлетка.

Гаспадар — Зараз прышлю (*выходзіць*).

Зьява 10-я.

Тыя-ж без Гаспадара.

Васіль — (*наліваючы чаркі*) Эх, брат! папсула яе гэта стара-руская адукацыя. Паненкай зрабіла! Ад працы і вёскі адарвала... нядарэчнасьць адна, ды і годзі!

З БЕЛАРУСКАГА ЖЫЦЬЦЯ

З дзейнасьці БНА. У мінулым тыдні адбыліся нарады органаў Беларускага Народнага Аб'еднаньня — 12.VI. Прэзыдыюму БНА, а 16.VI. Цэнтральнага К-ту БНА. Пастановы ЦК—БНА апублікуем у наступным нумары „Бел. Крыніцы."

Суд. 17.VI. адбыўся суд у Віл. Гарадзкім Судзе над рэд. Пазьняком за апулікаваньне ў „Бел. Крыніцы" адозвы ТБШ і БІГіК у справе падаваньня дэклярацыяў на беларускую школу. У судзе гр. Пазьняк даказваў, што беларусы ў 1925—1926—1927 г. падалі польскім школьным уладам дэклярацыяў на 1226 беларускіх школаў, а цяпер беларусы маюць, паводле выяўленьня Віленскага Щкольнага Куратара, толькі 69 школаў, у якіх дапускаецца беларускі язык. Пракурор адказаў, што гэныя цьверджаньні ня маюць урадавага сьцьверджаньня. Суд засудзіў гр. Пазьняка на 2 тыдні арышту і 40 зл. штрафу.

З выдавецкай нівы: *„За беларускую школу"* (аднаднёўка) 16 г. м. Школьны Сакратарыят выдаў пад гэткім загалоўкам аднаднёўку, якую адміністрацыйныя ўлады сканфіскавалі.

—*„Беларускі Фронт."* Надовячы паявілася пад гэткім загалоўкам новая газэта, якая мае выходзіць што месяц.

У ТБШ. 5 ліпня ў Вільні будзе Агульны Сход Т-ва Беларускае Школы.

Юбілей гуртка БІГіК. Гурток БІГіК у Жодзішках 12 ліпня 1936 г. арганізуе сьвяткаваньне юбілею 10-цігодзьдзя існаваньня гэтага-ж Гуртка. Дзеля гэтага будзе зладжана ўрачыстая акадэмія з наступнай праграмай:

1) Казімер Чартовіч прачытае рэфэрат на тэму: „Асьвета — як дзейнік культуры і цывілізацыі," 2) Справаздача з культ.-асьветнай дзейнасьці гуртка ад 12.VII.1926—12.VII.1936 г., 8) Хор прапяе некалькі бел. народных песьняў, 4) Дэклямацыі, 5) Гарбатка; 6) Таварыская забава. Пачатак а 14-ай гадз. Уваход бясплатны.

Экскурсія БСС у Наваградчыну. За прыкладам прошлага году Беларускі Студэнцкі Саюз УСБ з мэтаю пазнаваньня роднага Краю ладзіць сёлета турыстычную прагулку сяброў і сымпатыкаў у Наваградчыну. Зборка 12.VII сёл. у вёсцы Валяўцы (3 клм. ад возера Сьвітэзь) 13.VII. — над возерам Сьвітэзь. 14—Сьвітэзь—в. Вароньча — м. Цырын (прыблізна 20км.) 15—м. Цырын — в. Долматаўшчына—м. Турэц—м. Ярэмічы над Нёманам (25 клм.). 16—м. Ярэмічы—уздоўж Нёмну і Налібоцкае пушчы да Шчорсаў (20 клм.) углыб пушчы — возера Кромань 17—возера Кромань—м. Любча. 18 – Любча — м. Негневічы і 19—м. Негневічы — м. Наваградак. Разьвязаньне экскурсыі.

Z dziejnaści Litoŭskaha Dabradziejnaha T-wa.

7.VI adbyŭsia hadawy schod siabroŭ Lit. Dabradziejnaha T-wa ŭ Wilni. Na im staršynia Ks. Čibiras zrabiŭ dakład ab dziejnaści T-wa za minuły hod. Z dakładu, miž inšym, dawiedwajemsia, što T-wa ŭtrymliwaje 5 internataŭ u Wilni, i 1 ŭ Sejnach. U hetych internatach prabywajuć 332 asoby, z jakich 300 ŭ Wilni. Z ich 159—heta wučni Wil. Lit. Himnazii im. Witaŭta Wialikaha, 93—wučni pačatkawych škoł, a rešta — heta wučni roznaha ramiasła. T-wa utrymliwaje takža hetkija ramieślenyja pracoŭni:

1) šwalniu mužčynskaju. 2) šwalniu žanočuju, 3) stalarniu, 4) šawieckuju majstroŭniu i 5) ślasarniu.

Cikawa adznačyć, što haduncy internataŭ T-wa dobra wučacca. Heta świedča ab dobrym tam dahladzie ich i dobrym utrymańni.

Urad T-wa nie zdawolwajecca tolki tym, kab wučyć u škole swaich haduncoŭ, ale starajecca i ab tym usim, što ščylna źwiazana z patrebami sučasnaha žyćcia. Tak napr. siarod swaich haduncoŭ urad T-wa arhanizuje roznyja tak zw. „tydni," jak—hazet, čystaty, aščadnaści, narodu, ćwiarozaści i inš. Apračа hetaha siarod haduncoŭ u internatach isnujuć roznyja hurtki, jakija ładziać sabrańni, referaty i inš.

„Viln. Ryt." Nr. 46.

Z UKRAINSKAHA ŽYĆCIA.

Try źjezdy. U minułym tydni adbylisia ŭ Lwowie źjezdy troch ukrainskich kulturna-aświetnych i ekanamična-haspadarčych arhanizacyjaŭ — „Centrosojuzu", „Rewizyjnaha Sajuzu Ukrainskich Kooperatywaŭ" i „Proświty". Ahułam na hetych źjezdach było kala tysiačy delehataŭ.

„Taras Bulba" Gogola skanfiskawany. Ukrainskija hazety padajuć, što polskija ŭłady hety twor skanfiskawali.

Eŭropa na biezdarožžy.

Liha Narodaŭ, paśla zachapleńnia Italijaj Abisynii, zusim straciła swajo palityčnaje značeńnie, zhinuŭ nawat i maralny aŭtorytet henaj miždziaržaŭnaj ustanowy, jakaja dasiul była centram eŭrapejskich palityčnych sprečak, dzie dyplomaty, choć nia ščyra, hawaryli ab mižnarodnych sprawach i ab wysokaj idei suświetnaha miru. Ciapier hety centr, choć farmalna jašče isnuje, faktyčna razwaliŭsia. Ciapier eŭrapejskaja palityka adnaho centru nia maje i apirajecca na paasobnyja hrupy dziaržaŭ mienšych i wialikija dziaržawy. Hałoŭnymi „centrami" eŭrapejskaj palityki źjaŭlajucca: Anhlija, Francyja i Niamieččyna, intaresy jakich u mižnarodnaj palitycy zusim raźbiežnyja, a imknieńni supiarečnyja i nawat, u niekatorych sprawach, adny da druhich warožyja.

Woś-ža na hetym i palahaje biezdarožža eŭrapejskaj palityki.

Niamieččyna, imknučysia da swaich palityčnych metaŭ, wykarystoŭwaje supiarečnaści Anhlii z Francyjaj, a hetyja apošnija, nia mohučy wa ŭsich sprawach pahadzić miž saboju swaich intaresaŭ, adna suproć druhoj kirujucca ŭ palitycy adnosna Niamieččyny to prychilna, to suproć. Ahułam kažučy, ciapier eŭrapejskaja palityka amal całkom zaležna ad hetych troch wialikich dziaržaŭ, ad ich zaležny i mir i wajna ŭ Eŭropie.

Niamieččyna

Sučasnaja Niamieččyna pad uładaj Hitlera ŭ mižnarodnaj palitycy imkniecca da takoha značeńnia, kab mahčy dyktawać swaje palityčnyja plany inšym dziaržawam. Dziela hetaha jana silna zbroicca, na wajenny ład arhanizuje ŭsio nutranoje žyćcio dziaržawy i haduje swaich hramadzian u duchu wajennaha zachopnictwa čužoj terytoryi, kab dać bolšuju mahčymaść razrastacca niamieckaj rasie i raskošna žyć usim niemcam. Słowam, sučasnaja Niamieččyna heta kraina, jakaja hatowicca ŭ pachod na padboj słabiejšych dziaržaŭ i narodaŭ, kab pašyryć swajo waładańnie i dać mahčymaść raskošna žyć niemcam koštam inšych narodaŭ.

Anhlija.

Anhlija i ciapier taksama, jak i prad suświetnaj wajnoj, kirujecca ŭ mižnarodnym žyćci palitykaj h. zw. kanserwatyŭnaj. Jana, trymajučy pad saboj sotni miljonaŭ čužych narodaŭ, parabiŭšy z terytoryi hetych narodaŭ sabie kalonii, starajecca ŭsialakaj canoj hetyja ŭładańni pry sabie ŭtrymać. Dziela hetaha anhielskaja mižnarodnaja palityka šmat dzie supiarečnaj bywaje z zachopnictwam čužych terytoryjaŭ inšych dziaržaŭ, jak heta jość ciapier z sprawaj zachapleńnia Italijaj Abisynii ŭ Afrycy, abo niekatorymi zachopnickimi planami Japonii ŭ Azii. Słowam, Anhlija ŭžo nia imkniecca zachaplać čužyja ziemli, a tolki starajecca ŭtrymać kaliś zachoplenaje.

Francyja.

Francyja taksama maje swaje kalonii, jakimi starajecca waładać biassporna i dalej. Hetyja waładańni kalonijami i ahułam kalonijalnaja palityka bywajuć časta supiarečnyja z hetkaj palitykaj anhielskaj. Z hetaje pryčyny i nia moža całkom pahadzicca Francyja z Anhlijaj u mižnarodnaj palitycy. Pry hetym treba adznačyć, što Francyja maje pry boku zaŭsiodnaha woraha—Niamieččynu, jakaja na praciahu doŭhaj historyi i ciapier nia moža ściarpieć silnaj Francyi, jak pieraškody dla niamieckaj ekspansii ŭ Eŭropie. Dziela hetaha hałoŭny ciažar i sučasnaj siły niamieckaha nacisku na eŭrapejskija krainy padaje na Francyju; dziela hetaha francuski ŭrad zaklučyŭ sajuz uzajemnaj dapamohi z SSRR, dziela hetaha ŭ Francyi stwaryŭsia i „narodny antyfašystaŭski front," kab abapiorci na mocny hrunt i nutranyja siły Francyi ŭ abaronie suproć niamieckaha fašyzmu.

Pakul nia zusim była skampramitawanaj bieśsillem wykanańnia pastanoŭ Liha Narodaŭ, usie sprečnyja miž saboju sprawy mienšaha značeńnia wialikija dziaržawy mieli mahčymaść wyrašać „aŭtorytetam" pastanowaŭ hetaj Lihi, u jakoj jany-ž sami byli zaŭsiody hałoŭnymi kiraŭnikami i najmacniejšymi aŭtorytetami. Pry hetym, henyja najwialikšyja aŭtorytety tam u swajej Lizie hadzili i swaich palityčnych „sajuźnikaŭ"— mienšyja dziaržawy, jakija miž saboju tak-ža majuć mnoha sporaŭ. Ciapier užo i hetaha „aŭtorytetu" niama; ciapier miždziaržaŭnaja roŭnawaha ŭ Eŭropie ŭžo wyrazna mierajecca tolki militarnaj siłaj. A hetkija časy raznosiać pa świecie tolki smurod porachu.

Бацькі Беларусы! Вучэце сваіх дзетак беларускае граматы! Дамагайцеся роднае беларускае школы!

Пятрусь — Кінь, Васіль! Ты яе ня добра ведаеш. Усе мы людзі. Кожны—чалавек!

Васіль — Вось як? Выбач, братка, як бачу, ты яе ўсьця-ж кахаеш! Дык выбач, калі абразіў тваё пачуцьцё!

Пятрусь — Вось адразу і кахаеш! Праўда, я кахаў яе моцна, шчыра... Першы і мо' апошні раз кахаў! Але чым-жа яна вінавата была, што я не да спадобы ёй быў? (*п'е*) Я шчыры з табой, Васіль.

Васіль — Калі ласка, як-жа іначай!

Пятрусь — Бачыш братка, ня ведаю, ці кахаю, ці не? Толькі з галавы яна ў мяне ня выходзіць. Шкада мне яе, надта шкада! Каб ведаў, што жыве, што шчасьлівая — ня тое было-б, а так, як у ваду патанула. Мо' згінула пад плотам дзе?

Васіль — Нашто такія прыпушчэньні.

Пятрусь — Ня цеш Васіль! Вы ўсе яе не разумелі, яна кволая была, як краска якая! І той падлец абарваў, збрудзіў і пэўна кінуў у гразь! Даруй, Васіль! Надта набалела ўжо!

Ты вось пытаўся, чаму не жанюся?—Не магу пакахаць другую.

Васіль — Эг, Пятрусь, раскіс ты там у вёсцы! Вазьмі сябе у рукі! Жыцьцё— ня ідылія! У наш век сьмешна нават гэтак кахаць! І што кахаць? Створаныя самім прыгожыя мроі... Ад гэтага і да горшага не далёка!

Пятрусь — Хай гэта мроі! Але і ты ня праўду кажаш Васіль! З усім сваім вылічаньнем; з усім шаблённа-выхаваным падыходам да жыцьця і ты на мыльным шляху!

Васіль — Чаму? у чым ты бачыш гэту памылку?

Пятрусь — Калісь ты гаварыў мне, — калі жадаць чаго, то трэба моцна жадаць і заўсёды дасягнеш, — твае словы? Хай гэта мроі! Але ці-ж можна мацней жадаць. як жадаў іх я? І што-ж? Як бачыш, з носам! Відаць, душу жанчыны, вы матэрыялісты, яшчэ не расклалі на часткі... ня вылічылі, ня зважылі! Відаць і для вас неабмыльных і пэўных у-ва ўсім тут—ня ясна?

Васіль — Ну на такія рэчы, сказаўшы шчыра, мы цяпер зьвяртаем мала ўвагі!

Пятрусь — Не зьвяртаеце ўвагі? А нашто вы зьвяртаеце вашу ўвагу?

Васіль — На жыцьцё! На барацьбу з ім і за яго! На пракладаньне новых дарог грамадзкага ладу!

Пятрусь—А гэта павашаму ня жыцьцё?

Васіль — Так. Але гэта пытаньні іншай плошчы. І з зьменай грамадзкага ладу, зьмяняюцца яны, сілай рэчы, самі па сабе.

Ты глянь у гісторыю людзкасьці і там знойдзеш падцьверджаньне гэтага: з зьменай таго, ці іншага ладу, прыходзілі іншыя звычаі і адносіны сямейнага жыцьця. Зьмяняліся самі па сабе адносіны мужчыны да жанчыны і г. д.

Пятрусь — Але заўсёды былі, заўсёды пры ўсякім ладзе жылі на зямлі, кажучы патвоему, прыгожыя мроі.

Васіль — Ды нашто жадаць неразумнага, нашто жадаць недасягненага! Месяц таксама прыгожы, а дастань яго?

Пятрусь — Кінь Васіль! Тут мы з табой разьмінаемся. У палякоў ёсьць адно прыслоўе: „z braku laku, używa się smoła"— тэорыя кампрамісаў — мне яна вядома і не патрэбна. Маё пачуцьцё да Верачкі, гэта хранічная хвароба і здаецца ўсьця-ж разрастаецца і мацнее.

Зьява 11-я.

Тыя-ж і Верачка.

(*Уходзіць Верачка, у белым хвартуху, нясе два прыборы, не разглядаючыся ставіць на стол*).

Пятрусь — (*угледаючыся зьдзіўлены*) Верачка! (*устаючы*) Панна Вера, вы тут?

Верачка — (*Зьнячэўку, падняўшы вочы, надта зьмешаная і зьдзіўленая*) Божа! Пятрусь! Адкуль вы? Як вы сюды папалі?

Васіль — (*таксама зьдзіўлены*) Вось прыемнае спатканьне! Толькі што аб вас гаварылі!

Верачка — І Васіль? Ды вы, здаецца, тут у Вільні жывеце?

Васіль — Але, тут у Вільні і часамі заходзіў сюды і дзіўлюся, як гэта вас не спаткаў?

Верачка — Ну на гэта былі прычыны. А Пятрусь?

Пятрусь — Я з вёскі сяньня... па справунках...

Верачка — Дык вы з дому? з вёскі сяньня?

Пятрусь — Але, толькі зьлез з цягніка і нашчасьце спаткаў адразу Васіля.

Верачка — Дык скажыце, калі ласка, што там чуваць? Як мае бацькі? Ці жывы, ці здаровы?

Пятрусь — Нішто кратаюцца.. Па вас толькі вельмі сумуюць... бо яны ня ведаюць, што вы тут. Няведаюць нат', дзе вы. Чаму вы ім ня пісалі? Якія вы нядобрыя!

Васіль — (*перабіваючы*) Але чаму-ж мы стаім? Сядайце, калі ласка! Ці-ж так прыемна гаварыць?

Верачка — Дзякую!.. але вы-ж бачыце, мой абавязак, (*паказвае на хвартух*) з гэтага хлеб ем.

Васіль — Гэта ня робіць вам ганьбы.

Верачка — Але. (*усьмехаючыся*) Мне гэта ня вы першы кажаце!

Васіль — Вось як? Прыемна! Бачу вы зьмянілі крыху свае пагляды, з тае пары, як мы спатыкаліся, і здаецца у лепшы бок?

Верачка — Яшчэ як! Ды я іх і не мяняла, — самі зьмяніліся. Жыцьцё зьмяніла. З тае пары шмат чаго зьмянілася і прайшло.

Васіль — Але сядайце, калі ласка!... Так-жа не прыемна!

Верачка — Даруйце, скочу скажу пару слоў Гаспадару, ды скіну свой „мундзір."

Пятрусь — Навошта? Сядайце з намі і так!

Верачка — Зараз, зараз! Мушу атрымаць дазвол — служба!

Padhatoŭka da wajny na Dalokim Uschodzie

Japonija, pašyrajučy swaju ekspansiju ŭ Azii, wyciskaje adtul daŭno zakaraniŭšyjasia ŭ Azii ŭpływy rasiejskija. Balšawiki śpiarša pad naporam japonskaj ekspansii na niekatorych pazycyjach adstupali, a ŭ apošnija časy ŭzialisia za abaronu tam swaich intaresaŭ i pačali hatowicca da wajny z Japonijaj. Pawodle dokazaŭ japonskich wajskowych kruhoŭ, balšawiki pastawili ŭžo na mandžurskaj hranicy 10 dywizijaŭ piechaty, niekalki dywizijaŭ konnicy, 900 araplanaŭ, 700 tankaŭ. Aprača hetaha, balšawiki zbudawali kala stancyi Mačuli, Błahawieščanska i Chabaraŭska wialikija ŭkrapleńni. Silna ŭkrapili Władywastok, a ŭ jaho prystani skancentrawali balšawiki 50 padwodnych łodak. Hazety padajuć, što balšawiki i dalej ukraplajucca na Dalokim Uschodzie.

Krywawyja zabureńni ŭ Palestynie

Krywawyja zabureńni ŭ Palestynie, jakimi araby zmahajucca z žydami, adbywajucca dalej. Anhielskaja tam ułada starajecca pahadzić hetyja dwa narody i spyniaje zabureńni palicyjnymi sposabami U hetych zabureńniach najbolš cierpiać žydy, jakich araby bjuć i palać žydoŭskija budynki.

Z polskaha Sojmu

U Sojmie adbywajucca narady specyjalnych kamisijaŭ. Hetyja narady wyjaŭlajuć ciažkoje haspadarčaje pałažeńnie. Ministar skarbu Kwiatkoŭski ŭ sojmawaj kamisii wystupiŭ z pramowaj, u jakoj wostra zaatakawaŭ mižnarodnuju i nutranuju spekulacyju, jakaja imkniecca padarwać roŭnawahu polskaj waluty. Ministar hawaryŭ tak-ža ab inwestycyjnych rabotach i baraćbie z biezraboćciem. Dziela realizacyi namiečanaha ŭradam planu, kazaŭ ministar, treba raśpisać nowuju inwestycyjnuju pazyčku na sumu 200—300 miljonaŭ zł.

Sojm daŭ prezydentu dziaržawy poŭnamoctwy wydawać dekretami zakony ŭ haspadarčych sprawach.

Roznyja wiestki

Z POLŠČY

Źjezd daśledčykaŭ mowaŭ nierasiejskich narodaŭ pad Sawietami ŭ Waršawie. U Waršawie 31 traŭnia i 1 červienia siol. adbyŭsia źjezd daśledčykaŭ mowaŭ nierasiejskich narodaŭ pad Sawietami, u jakim prymaŭ učaście tak-ža i biełarus d-r Janka Stankiewič. Hety źjezd u swajej pastanowie śćwiardžaje, — što rasiejskaja balšawickaja partyja ad 1929 hodu prystupiła da systematyčnaj rusyfikacyi praz swaje orhany mowaŭ usich nierasiejskich narodaŭ, u pieršuju čarhu Azerbejdžanu, Biełarusi, Hruzii, Idel-Urału, Inhrii, Karelii, Komi, Krymu, Kubani, Paŭnoč.-Kaŭkazu, Turkiestanu, Ukrainy i inšych.

Suproć hetaj rusyfikacyi mowaŭ nierasiejskich narodaŭ, hety Źjezd złažyŭ uračysty pratest.

Zabureńni, strajki, demonstracyi i palityčnyja pracesy. — 8 h. m. u Toruni miž strajkujuymi rabotnikami i palicyjaj dajšło da sutyčki, u časie jakoj ciažka byŭ ranieny adzin z rabotnikaŭ — Juljan Nowicki, katory ŭ chutkim časie pamior.

— 15 h. m. adbyłasia tak-ža sutyčka miž strajkujučymi rabotnikami i palicyjaj u Krasnym Stawie kala Lublina. U wyniku hetaje sutyčki było raniena dwuch rabotnikaŭ, z jakich adzin pamior.

— U Krakawie strajkujuć rabotniki fabryki „Čas". U Waršawie strajkujuć rabotniki 24 cahielniaŭ. U Stryi strajkujuć młynary, u Kałomyi rabotniki cahielni „Ramleroŭka", u Tarnopali strajkuje 120 piakarskich pamocnikaŭ, u Tarnowie razaki drewa. Strajkujuć tak-ža častkawa rabotniki i ŭ Gdyni, dzie dachodziła nawat da sutyčak z palicyjaj. U časie adnej z takich sutyčak było 8 asob raniena, pry tym adzin z ranienych rabotnikaŭ — Čapski — pamior. Adbywajucca tak-ža strajki i niedaloka nas — u našym Krai. — Tak naprykład: niadaŭna ŭznoŭ wybuch pratestacyjny ahulny strajk u Lidzie. Pryčynaj byccam hetaha strajku jość strajk u Niomnie, katory ŭžo trywaje blizu try miesiacy. Jak u Niomnie, tak i ŭ Lidzie, adbywajucca časta demonstracyi, jakija palicyja razhaniaje humowymi pałkami.

— U Chołmie 300 biezrabotnych rabotnikaŭ uwarwalisia ŭ pamieškańnie magistratu i, zabarykadawaŭšy ŭsie ŭwachody, damahalisia pracy. Dziela taho, što prezydent miesta abiacaŭ pracu dać, rabotniki razyjšlisia.

— U Minsku Mazowieckim, dzie žyd zabiŭ polskaha sieržanta, žycharychryścijanie raźbirali i palili žydoŭskuju majemaść, a žydoŭ wyhaniali. Žydy ŭciakali ŭ Waršawu, a ciapier pry pomačy palicyi wiartajucca nazad.

— U Lešnie paznanski Akružny Sud razhladaje sprawu 49 siabroŭ endeckaje arhanizacyi, abwinawačanych u arhanizawańni nielehalnaha terorystyčnaha sajuzu, katory kidaŭ bomby na prychilnikaŭ sanacyi i inš.

— U Radomie adbywajecca wialiki sialanska-žydoŭski praces u sprawie antyžydoŭskich krywawych zabureńniaŭ u Przytyku.

— U Krakawie adbywajecca sud nad rabotnikami, abwinawačynami za ŭčaście ŭ krywawych krakaŭskich padziejach, katoryja adbylisia sioleta ŭ m-cy sakawiku.

— U Lwowie uznoŭ-ža sudziać učaśnikaŭ lwoŭskich krywawych padziejaŭ, katoryja adbywalisia ŭ m-cy krasawiku.

— U Katowicach adbywajecca wialiki praces miascowych niemcaŭ-hitleraŭcaŭ, katoryja mieli na mecie wyklikać na Śląsku paŭstańnie i dałučyć jaho da Niamieččyny. Cikawa zaznačyć, što hitleraŭcy hetyja sarhanizawali sajuz, jaki abymaŭ 15,000 asob, a siarod ich było wielmi mnoha palakoŭ. Prysiaha ŭ henym sajuzie była składana na wiernaść Niamieččyny i Hitlera, katoramu pryrakałasia absalutnaja pasłušnaść.

Deficyt. Dziaržaŭnyja raschody ŭ m-cy traŭni sioleta ŭ Polščy siahali 174,322 tys. zł., a prychod — 174,117 tys. zł. Takim čynam m-c trawień daŭ 205 tys. zł. deficytu.

Z ZAHRANICY

Pamior Maksim Gorkij. 18 h m. u m. Gorkach kala Maskwy pamior wialiki rasiejski praletarski piśmieńnik Maksim Gorkij.

Strašny wybuch. U Talinie (Reviel-Estonija) u wajskowaj laboratoryi razarwaŭsia wialiki snarad. U časie razrywu zhinuła 70 asob.

Chatniaja wajna ŭ Kitai. Niadaŭna ŭ Kitai wybuchła chatniaja wajna, jakaja adnak zacichła na zaklik kitajskaha maršała Čang-Kaj-Šeka.

Strajki ŭ Francyi i Belhii. Jak my ŭžo pisali, u Francyi adbywalisia masawyja i paŭsiudnyja strajki. Apošnim časam strajki ŭ Francyi krychu ŭžo zacichli. Zatoje padobna, jak u Francyi, adbywajucca ciapier wialikija i masawyja strajki ŭ Belhii.

Padarožža Negusa. Abisynski car niadaŭna pryjechaŭ u Londan, nie znajšoŭ adnak jon tut spakoju, choć žychary Londanu spatkali jaho wielmi ŭračysta. Biedny Nehus byŭ wielmi niawyhadnym haściom dla anhielskaha ŭradu, katory nawat byccam „paradziŭ" jamu wyjechać z Londanu. Ciapier Negus dumaje jechać u Žeńewu, ale zdajeccca, što sumny los jaho i tut spatkaje, bo-ž u Lizie Narodaŭ panuje poŭnaje biazładździe. Dy, urešcie, pieramožanyja pierawažna nia majuć padtrymańnia. Ahułam pałažeńnie Abisynii wielmi ciažkoje, nia hledziačy na toje, što ŭ krai hetym štorazbolš uzrastajuć na sile abisynskija niezadawaleńni i zabureńni suproć italijanskich akupantaŭ, katoryja biez ceremonii biarucca za „čornaje" nasielnictwa.

Z WILNI I WILENŠČYNY.

Hradabićcie. Nad niekatorymi miascowaściami Wilenščyny praniasłosia hradabićcie, prynosiačy sialanstwu wialikija straty. Asabliwa, zdajecca, paciarpieli Duniławičy ŭ Dziesnienskim pawiecie, dzie pasiewy badaj zusim źniščany.

Latunskaja katastrofa. 8 h. m. u Wilni upaŭ wajskowy samalot na dom pry wul. Dombroŭskaha 5. Pry tym zhinuła dwoch polskich latunoŭ.

Trapiŭ u Miensk. 14 h. m. u Wilni byŭ zarhanizawany ablot polskich samalotaŭ nad h. zw. paŭnočnaŭschodnimi ziemlami. U časie hetaha ablotu adzin samalot trapiŭ až u Miensk...

Piśmy z wioski

„Łączko, łączko zielona" na ćwintary

(*Gieraniony, Lidzkaha paw.*).

Nasialeńnie našaj wakolicy haworyć pabiełarusku, ale niaświedama ŭważaje siabie „polskaj wiery."

Niadaŭna pryjaždžaŭ da našaha kaścioła wilenski arcybiskup. Pryjmali arcypastyra ŭračysta. U kaściele paśla sprawazdačy probaršča hawaryŭ arcybiskup. Mowa jaho — heta cikawy prykład polskaha „patryjotyzmu" siarod biełarusaŭ. Paśla kryžmawańnia dziaciej pačalisia sprawazdačy pradstaŭnikoŭ miascowych arhanizacyjaŭ. Arcybiskup Jabłžykoŭski siadzieŭ na ćwintary, na ŭbranym zialonymi biarozkami pasadzie. Twar jaho świaciŭ radaściaj, jak miesiac u świetłuju noč. Miascowy abšarnik raskazaŭ ab dziejnaści kaścielnych arhanizacyjaŭ u našaj parachwii ŭ ahulnaści, jaho žonka ab „Kat. Stow. Kobiet," jaho dačka, staŭšy na „bačnaść," ab „Stow. Mł. Kat. Žen." Arcybiskup na raskaz kožnaha adkazwaŭ z „gracyjaju." Kali skončyła dačka abšarnika, arcybiskup z wietliwaj ŭśmieškaj źwiarnuŭsia da moładzi z SMK: „A znacie „Hymn Młodych." Może zaśpiewacie?!"

Zaraz-ža zahučeŭ na ćwintary „Hymn Młodych." Potym arcybiskup wydaŭ probaršču našaj parachwii prykaz, kab załažyŭ u miascowych škołach „Krucjatu Eucharystyčnu" i zyjšoŭšy z padwyšeńnia, na jakim byŭ pastaŭleny jahony pasad, skazaŭ dzieciam, kab što choć zaśpiawali: „Może „Płynie Wisła, płynie," może „Chwalcie cieniste gaiki," może umiecie: „Łączko, łączko zielona." Ale dzieci byli źbiantežanyja widam arcykapłana. Wučyciali admaŭlalisia. Ničoha, arcybiskup zaŭpiorsia. Zaraz pa ćwintary paskakaŭ hołas polskaj pieśni. Chłopcy-padšywalcy kazali, što ŭ dziaciej, što piajali, hołas dryžeŭ, jak ŭ padrezanaha jahniaci. A staryja babki, stojačy pad ścienami kaścioła, ciskali plačyma: — „Čamu heta „wyskup" kazaŭ śpiawać pad dźwiaryma kaścioła „brandziuški," choć i polskija, ale „brandziuški." Hetu ŭračystaść zakončyła „Boże, coś Polskę," jakuju zahadaŭ arcybiskup piajać „staršym obywatelom."

Parachwijanin.

Запіскі і ўвагі.

Уселюб, Наваградзкага пав. Даўно я пісаў у „Бел. Крыніцу," бо такія злажыліся варункі, што ня мог пасьвяціць часу на пісаньне ў газэту. Займаўся я чытаньнем кніжак і працаваў на ніве пашырэньня культуры на вёсцы. Цяпер узяўся за пяро і буду пісаць аб жыцьці беларусаў, аб беларускім руху, бо карэспандэнцыі з сяла ў газэце ўзбуджаюць большае зацікаўленьне сялян да сваей газэты і агулам да беларускай справы. А пісаць з нашай Наваградзкай вёскі ёсьць аб чым; проста ня пісаць, а голасна крычаць на ўвесь сьвет аб тутэйшым жыцьці-быцьці беларускага сялянства.

Нашыя вёскі магчыма горш за ўсе іншыя тануць у цемры і патрабуюць асьветы, але паміма гэтага арганізацыяў беларускіх культурна-асьветных няма. Усе гурткі ТБШ, якія калісь былі ў нашых ваколіцах, цяпер ня дзеюць, цяпер іх няма; спробы ўзнавіць дзейнасьць гурткоў ТБШ да рэзультатаў іх дзеяньня, не ўдаюцца; спробы залажыць новы гурток БІГіК. так-жа не ўдаюцца і мусіць лягчэй нашай моладзі выехаць у Аргентыну, чымся залажыць гурток беларускай культурна-асьветнай арганізацыі.

Праўда, існуюць у нас розныя „кулкі" і „пшыспособені," але, каб не паўтараць таго, што іншыя пісалі, скажу коратка —яны да нічога, яны ня маюць ніякага ўплыву, бо яны чужыя.

Школа кругом польская; але ці ведаюць адказныя кіраўнікі, што гэная школа не асягае сваіх намераў і ня можа выканаць свайго заданьня школы, бо яна для нашых дзяцей чужамоўная — вучні не разумеюць ані польскае мовы, у якой іх вучыцель вучыць, ані не разумеюць і вучыцеля.

Мімавольна тут ціснуцца думкі аб школьным плебісцыце, які цяпер беларусы праводзяць. У нас гэты плебісцыт праходзіць глуха, бо няма каму пакіраваць гэнай справай, няма арганізацыяў, няма і адзінак, няма інструкцыяў, няма і беларускай прэсы ў дастатачным ліку.

Апошнімі часамі польскія газэты апублікавалі, што „PMS" (гарэлачны манаполь) пазволіў прадаваць гарэлку ў вёсцы. Прад вачыма рысуецца абраз бруднай з п'янымі людзьмі карчмы на канцы вёскі. Няўжо-ж гэткая „інстытуцыя" будзе мець дадатні ўплыў на нашых людзей. Няўжо-ж беларусам карчма заменіць беларускую арганізацыю. Не! карчма з гарэлкай у беларускай вёсцы, гэта затрыманьне мысьлёвага разьвіцьця людзей, гэта абніжэньне моральнасьці сялян, гэта адна з многіх прычын беднасьці і сямейнага няладу. Дурман гарэлкі і так ужо многа робіць шкоды і бяды нашаму народу. Сёлета на запускі ў нас пад уплывам дурману гарэлкі „стралец" забіў сябру „Кола Млодзежы Вейскай."

Здаецца глуха, здаецца ціха... Аке страшнавата, быццам прад бурай... Шопаты нараканьняў у напружанасьці з вёскі разносяцца крыкам. І сапраўды, хто ня ведае нашае вёскі, той ня мае веры ў наш народ, той толькі адважна выступае з «новасьцямі» супроць настрояў сялянства, бо ня ведае сілы духа беларускага народу і толькі тыя паддаюцца апатыі, шукаючы апірышча ў сільнейшых.

А. Пап.

БЕЛАРУСКАЯ КНІГАРНЯ

„Надзея"

(раней Ул. Манкевіча, яшчэ раней Беларускага Выдавецкага Т—ва) Вільня, Астрабрамская вул. № 1

прадае ўсе беларускія кніжкі, песеньнікі, часапісы, календары, сьценкі да календароў і інш.

Заказы выпаўняюцца борзда й акуратна.

Хто выпісвае з кнігарні „Надзея" болей як на адну залатоўку і пры тым пасылае грошы наперад, той за перасылку па пошце ня плаціць. Выпісваючы ня болей як на адну залатоўку, трэба дадаць на перасылку 15 грашоў.

Хто выпісвае да трох зал., можа грошы пасылаць у лісьце паштовымі значкамі.

Калі-б выпісваныя кніжкі ці іншае прапалі на пошце, дык кнігарня „Надзея" варочае ўсе панесеныя выпісываючым страты.

Redaktar Jan Paźniak. Biełaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny ŭ Wilni, Zawalnaja 1 — 2. Wydawiec A. Šutowič